5) Для учащихся гуманитарного склада ума весьма привлекательны упражнения, которые могут иметь 2 варианта: записаны на доске или воспринимаются на слух (более сложный вариант). Учитель произносит числа: *1, 3, 5, 7;* величины: *длина, масса, время, объём*. Требуется повторить слова на буквы О, С.

Следует отметить, что для обучения запоминанию можно использовать разнообразные приёмы. Мы опирались на классификацию О. Науменко, Е. Шершицкой: приемы группировки учебного материала, классификации, ассоциаций (им довольно часто пользуются учителя – 80% опрошенных), прием поисков опорного пункта, приемы аналогии, схематизации, достраивания, структурирования материала.

Указанные приемы результативны, если регулярно включаются в методическую канву урока. Так, учащиеся 2 класса с удовольствием работали «*В римской комнате*»: запоминаемые единицы информации расставляются в классе в установленном порядке. Большинство учащихся (81,5%) назвали данный прием наиболее полезным для них, что свидетельствует о непосредственной заинтересованности школьников.

Учащиеся 2–3 классов выделили также прием «*Задай мудрый вопрос*» (70,8% – 34 респондента), который целесообразен на этапе коррекции знаний, подведения итогов, на обобщающем уроке. Школьники учатся не только формулировать вопрос, но и оперировать понятиями, формулами, определениями. Однако учитель должен осознавать, что указанные приемы эффективны, если к ним обращаться регулярно.

**Заключение.** Сделаем некоторые выводы. Активная мыслительная деятельность младших школьников – условие создания благоприятной для процесса запоминания атмосферы на уроках математики. Включение в систему упражнений заданий для развития различных видов памяти, опора на специальные приемы по обучению запоминанию информации, систематическое повторение материала обеспечивают развитие долговременной памяти, успешность формирования математических умений и навыков.


Литература

1. Науменко, О.В., Шершицкая, Е.А. Возможности развития памяти учащихся на уроке математики / О.В. Науменко, Е.А. Шершицкая // Начальная школа плюс До и После. – 2004. – № 9. – С. 29–33.
2. Черемошкина, Л.В. Психология памяти: Учеб. пособие для студентов вузов / Л.В. Черемошкина. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Аспект Пресс, 2009. – 319 с.
3. Муравьёва, Г.Л. Математика: учеб. пособие для 3-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения: в 2 ч. / Г.Л. Муравьёва, М.А. Урбан. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск: Нац. ин-т образования, 2017. – Ч.1. – 136 с.: ил.


## ВЫВУЧЭННЕ МАЎЛЕНЧАГА ЭТЫКЕТУ Ў СТАРЭЙШЫХ ДАШКОЛЬНІКАЎ З ПАРУШЭННЯМІ ПСІХІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ (ЦЯЖКАСЦЯМІ Ў НАВУЧАННІ)


***Ягоранкава В.Г.***

*магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік – Лауткіна С.У., канд. псіхал. навук, дацэнт


Сучаснае грамадства ставіць перад педагогамі адукацыйных установаў задачу падрыхтоўкі дашкольнікаў, здольных самастойна здабываць веды і гатовых да прымянення гэтых ведаў на практыцы. Для таго, каб вырашыць дадзеную задачу, неабходны пошук сучасных формаў, метадаў і сродкаў навучання, здольных забяспечыць больш шырокія магчымасці развіцця, саморазвіцця і самарэалізацыі асобы. У адпаведнасці з дзяржаўнымі патрабаваннямі псіхолага-педагагічная праца з дашкольнікамі павінна быць накіравана на фарміраванне ў іх інтэгратыўнасці якасцяў і будавацца ў адпаведнасці з прынцыпамі развіваючага навучання. Згодна з новымі патрабаваннямі вельмі важным становіцца маўленчае развіццё дашкольнікаў, адной з задач якога з'яўляецца авалоданне нормамі роднай мовы [1, с. 21]. Засваенне маўленчага этыкету павінна адбывацца з ранняга дзяцінства. Маўленчай этыкет ўяўляе сабой асаблівыя правілы і нормы маўленчых паводзін, якія вызначаюцца ўзаемаадносінамі тых, хто размаўляе, прынятыя пэўным калектывам, і залежаць ад абстаноўкі зносін [2, с.18].

Мэта даследавання – выявіць, тэарэтычна абгрунтаваць і эксперыментальна праверыць педагагічныя ўмовы, якія спрыяюць больш эфектыўнаму фарміраванню маўленчага этыкету ў дзяцей дашкольнага ўзросту з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні).

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужылі асабістыя справы дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні, пратаколы назіранняў за паводзінамі дзяцей і гутарак з дашкольнікамі і бацькамі. Выкарыстоўваліся тэарэтычныя метады (фармальна-лагічны аналіз, логіка-дэдуктыўны метад, прагназаванне), эмпірычныя метады (гутаркі, назіранне, педагагічны эксперымент), метады матэматычнай статыстыкі. Галоўная задача даследавання складалася ў атрыманні уяўленняў аб тым, наколькі дзеці валодаюць ведамі аб правілах этыкету, а таксама наколькі гэтыя веды выкарыстоўваюцца ў паўсядзённым жыцці і ў розных сітуацыях.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У канцы 90-х гг. XX стагоддзя былі праведзены псіхалагічныя даследаванні, дзе было паказана, што колькасць дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні, абумоўленыя затрымкай псіхічнага развіцця (ЗПР), штогод павялічваецца. Гэта адбываецца ў сувязі з тым, што, па-першае, колькасць фактараў, здольных стаць прычынай парушэння развіцця, пастаянна расце; па-другое, усе меншая колькасць дзяцей спраўляюцца з пастаянна змяняючыміся адукацыйнымі праграмамі; і па-



Репозиторий ВГУ

трэцяе, удасканальваюцца метады дыягностыкі, што дае магчымасць дакладней вызначаць узровень развіцця дзіцяці, адлучаючы не толькі "норму" ад "нормы", але і выяўляючы розныя формы і ступені паталогіі развіцця [3, с.82].

На сённяшні дзень у спецыяльнай педагогіцы існуе шэраг даследаванняў, у якіх раскрываюцца асаблівасці пазнавальнай дзейнасці, мыслення, зносін, гульнявой дзейнасці дзяцей з ЗПР. Назапашаны вялікі вопыт арганізацыі карэкцыйнай працы з дзецьмі, якія перажываюць цяжкасці ў засваенні адукацыйнай праграмы. Разам з тым, многія пытанні па сённяшні дзень застаюцца недастаткова распрацаванымі. Сярод іх – праблема вывучэння і фарміравання маўленчага этыкету ў дашкольнікаў з ЗПР. Гэтае пытанне не было спецыяльна вывучана навукоўцамі, у сувязі з чым абумоўлена актуальнасць нашай працы, мэтай якой з'яўляецца вывучэнне маўленчага этыкету ў дашкольнікаў з ЗПР.

Даследаванне праводзілася на базе ДУА «Спецыяльны дзіцячы садок № 64 г. Віцебска». У нашым даследаванні прынялі ўдзел 10 дашкольнікаў старэйшай групы – 5 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак ва ўзросце ад 5 да 6 гадоў. Асноўным метадам даследавання з'явілася назіранне за дзецьмі ў паўсядзённым жыцці, у звычайнай абстаноўцы, без змены распарадку дня. Падчас назіранняў было зафіксавана ўжыванне слоў прывітання раніцай, выразы просьбаў аб дапамозе або падзякі на працягу дня, розныя праявы ветлівых зносін у сітуацыях, калі гэта было дарэчы і неабходна. Пасля гэтага з кожным дзіцем была праведзена індывідуальная гутарка для высвятлення ведаў дзіцяці аб маўленчым этыкеце. Усе гэтыя звесткі супастаўляліся з вынікамі назіранняў. У выпадку, калі дзеці не хацелі размаўляць на дадзеную тэму, мы гаварылі з бацькамі.

Узровень развіцця маўленчага этыкету ў дашкольнікаў з ЗПР ўсталёўваўся па чатырох асноўных крытэрыях: 1) веданне этыкетных формул прывітання, развітання і зносін паміж дарослымі і дзецьмі, дзецьмі і аднагодкамі ў рэчышчы праяваў ветлівасці; 2) дзеянні і ўчынкі дзяцей, якія выяўляліся ў прымяненні розных знакаў увагі да дарослых і аднагодкаў; 3) навыкі сервіроўкі стала; 4) паводзіны за сталом падчас прыёму ежы, уменне карыстацца лыжкай і відэльцам, сурвэткай, акуратны прыём ежы ў залежнасці ад яе выгляду, ўборка посуду за сабой пасля ежы.

Кожны паказчык ацэньваўся ў балах, што адпавядала тром узроўням: высокага, сярэдняга, нізкага (табліца). На падставе дадзеных крытэрыяў ацэнкі, з улікам вынікаў назірання і гутаркі з дзецьмі былі падведзены вынікі эксперыменту. Паказана, што высокім узроўнем маўленчага этыкету (10 – 12 балаў) валодае толькі адзін дзіця, на сярэднім узроўні (9 – 7 балаў) знаходзяцца 6 дзяцей, і на нізкім (4 – 6 балаў) – трое дзяцей. У працэнтных адносінах высокі ўзровень – 10%, сярэдні ўзровень 60%, нізкі ўзровень – 30%.

Табліца – Змест крытэрыяў ацэнкі паводзін дзяцей эксперыментальнай групы

| Паказчыкі / узроўні | Нізкі – 1 бал | Сярэдні – 2 бала | Высокі –3 бала |
|---|---|---|---|
| 1. Валоданне этыкетнымі формамі | Ведае агульна, выкарыстоўвае пры напаміне | Усе формы ведае, але выкарыстоўвае не заўседы | Пастаянна выкарыстоўвае без напаміну |
| 2. Дзеянні, учынкі дзяцей | Не бачыць неабходнасці | Зрэдку праяўляе ініцыятыву | Заўседы праяўляе увагу |
| 3. Сервіроўка стала | Сервіруе з дапамогай няні ці іншых дзяцей | Ведае, як усе рабіць, але блытае прыборы | Выдатна дзяжурыць за сталом, дапамагае іншым |
| 4. Паводзіны за сталом | Есць павольна, неакуратна, забывае прыбраць | Зрэдку можа выліць суп ці гарбату | Есць акуратна, прыбірае за сабою |

Акрамя таго, было ўстаноўлена, што дзяўчынкі значна больш паспяхова засвойваюць правілы маўленчага этыкету, усе яны знаходзяцца на высокім (1) і сярэднім (4) узроўні, хлопчыкі ж паказалі сярэдні (2 чалавекі) і нізкі (3 чалавекі) ўзроўні.

На падставе гэтых дадзеных можна высветліць, у якой вобласці этыкету дзеці маюць большыя поспехі, а дзе патрэбна выхаваўча-адукацыйная праца.

Устаноўлена, што практычна ўсе дзеці знаходзяцца на сярэднім узроўні развіцця этыкету. У працэнтных адносінах веданне і ўжыванне этыкетных формаў складае 57%, этыкетныя паводзіны ў побыце 53%, уменне сервіраваць стол – 57%, і уменне паводзіць сябе за сталом – 66% ад высокага ўзроўню развіцця дадзеных уменняў і навыкаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, праведзены намі эксперымент паказаў, што ўзровень развіцця маўленчага этыкету ў дзяцей з ЗПР знаходзіцца пераважна на сярэднім узроўні, што з'яўляецца нормай, аднак патрабуецца спецыяльная работа па фарміраванню ў дзяцей сучасных уяўленняў аб маўленчым этыкеце, які выкарыстоўваецца у зносінах з дарослымі і аднагодкамі.

Літаратура


1. Формановская, Н.И. Речевой этикет в русском общении. Теория и практика / Н.И. Формановская. – М.: ВК, 2009. – 334 с.
2. Винокур, Г.О. Культура языка / Г.О. Винокур. – М.: КомКнига, 2010. – 352 с.
3. Локтева, Е. В. Содержание работы по формированию коммуникативных навыков и умений у старших дошкольников с ЗПР в дошкольном образовательном учреждении компенсирующего вида /Е.В. Локтева // Дефектология. – 2012. – № 6. – С. 81–83.




Рэпазіторый ВДУ